ЧЫРВОНКА
ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

18 ЧЭРВЕНЯ 2015 г. ЧАЦВЕР № 114 (27972) Кошт 2000 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА



**Uzari: «Для ўсяго свой час»**



**Чэмпіёнка... па шыцці**



**Віншуем, пераможцы конкурсу «ЧЗ»!**

*ЦЫТАТА ДНЯ*



**Вячаслаў ШМІДТ, начальнік упраўлення энергетыкі і навукова-тэхнічнага развіцця Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі:**

*«Арганізацыі жыллёва-камунальнай гаспадаркі працуюць над скарачэннем тэрмінаў адключэння гарачай вады ў летні перыяд. Зрабіць гэта можна за кошт замены стальных труб поліэтыленавымі. Адпадае неабходнасць выпрабавання саміх цеплавых сетак, паколькі трубы з поліэтылену не падвяргаюцца карозіі. Але сам працэс падрыхтоўкі ўсёй цеплавой гаспадаркі да зімы патрабуе часу. Гэта значыць, поўнасцю адысці ад адключэння гарачай вады пры існуючых схемах цеплазабеспячэння нельга».*

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.06.2015 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 15461,00 | ▲ |
| Еўра | 17421,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 286,02 | ▲ |
| Укр. грыўня | 717,45 | ▲ |

ISSN 1990 - 763X

# РАМОНКАВАЕ ЖНІВО



Фота БЕЛТА.

Вадзіцель Юрый ФЯДОТАЎ прывозіць з поля і выгружае кветкавы намалот.

**У саўгасе «Вялікае Мажэйкава», што ў Шчучынскім раёне, пачаўся збор лекавых рамонкаў. Ідзе ён у прамысловых маштабах: сельгаспрадпрыемства — асноўны вытворца лекавых траў у краіне, і пад адны толькі рамонкі тут адведзена 300 гектараў.**

■ Прэстыж прафесіі

# КЛУБ «ЗАЛАТЫЯ РУКІ»

## Гаворым «рабочы», маем на ўвазе «інжынер»

**15 чэрвеня ў краіне распачаўся прыём дакументаў у прафесійна-тэхнічныя навучальныя ўстановы. Навучэнцаў чакаюць 185 устаноў, якія рыхтуюць па 300 рабочых прафесіях.**

— Беларусь не толькі захавала сістэму прафесійнай адукацыі, але і развіла яе. Сёння нашы каледжы і іх аснашчэнне не саступаюць вышэйшым навучальным установам, і абітурыенты павінны пра гэта ведаць, — падкрэслівае **міністр адукацыі Міхаіл ЖУРАЎКОЎ**.

У апошнія гады стандарты прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі істотна змяніліся. Патрабаванні да рабочых спецыяльнасцяў сур'ёзна адрозніваюцца ад тых, што былі, скажам, 10 ці 20 гадоў таму. Сучасны рабочы — гэта эрудзіраваны, высокакваліфікаваны спецыяліст, які, акрамя прафесійных ведаў, павінен валодаць спецыфічнымі навыкамі ў сумежных галінах, у тым ліку разбірацца ў інфармацыйных тэхналогіях, робататэхніцы і г.д. Такіх спецыялістаў толькі з вялікай нацяжкай можна назваць рабочымі ў звыклым разуменні гэтага слова, бо па сутнасці яны інжынеры.

У многіх краінах свету сёння вядуцца размовы пра перагляд падыходаў да рабочых спецыяльнасцяў і кваліфікацый. Некаторыя рабочыя спецыяльнасці або ўжо зніклі, або блізкія да знікнення. Замест іх з'яўляюцца іншыя, з прынцыпова новым узроўнем падрыхтоўкі. Цяпер каб выконваць на вытворчасці спецыяльныя функцыі, рабочаму недастаткова валодаць толькі пэўнымі навыкамі — трэба мець шырокі дыяпазон ведаў у сумежных галінах.

СТАР. 3

ЗВЯЗДА
Да чытача з любоўю!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА
5 разоў на тыдзень!
Ідзе падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2015 года!
Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.